*Мой род – мая радзіма*

# Язавецкія валошкі *Анатоля Бутэвіча*



19 чэрвеня ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў рамках праекта Беларускага фонду культуры і «Краязнаўчай газеты» «Мой род – мая радзіма» прайшла творчая сустрэча з Анатолем Бутэвічам. Яна была прымеркаваная да 70-годдзя пісьменніка, перакладчыка, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча, намесніка старшыні БФК. Да імпрэзы была падрыхтаваная кніжная выстаўка, што адлюстравала ягоную шматгранную творчасць.

На сустрэчу сабраліся прыхільнікі творчасці пісьменніка, землякі, калегі па працы ў розныя часы яго дзейнасці журналістам, міністрам, дыпламатам. Рамантычны настрой ствараў гурт старадаўняй музыкі «Brevis».

Са словамі прыязнасці і з расповедамі аб сумеснай працы выступілі старшыня БФК Тадэуш Стружэцкі, галоўны рэдактар нашай газеты Уладзімір Гілеп, намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Аляксандр Яцко, першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Павел Лёгкі, дзяржаўныя дзеячы Уладзімір Дражын, Віктар Гайсёнак ды іншыя. Свае вітанні даслалі Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч, пасол Рэспублікі Беларусь у Францыі, Пастаянны прадстаўнік Рэспублікі Беларусь пры ЮНЕСКА Павел Латушка. Але не толькі дзяржаўныя ды грамадскія дзеячы мелі слова – выступілі пісьменнікі Васіль Зуёнак і Уладзімір Ліпскі, акадэмік Радзім Гарэцкі, дырэктар НББ Раман Матульскі. Сярод узнагародаў, кветак і падарункаў, што атрымаў А. Бутэвіч пад час сустрэчы, карціна Лізы Лазоўскай, якую падараваў БФК: вялікае жытнёвае поле на Нясвіжчыне, астравок васількоў-валошак, любімых кветак юбіляра, Свята-Пакроўская царква ў вёсцы Вялікая Ліпа, а дзесьці ўдалечыні, на гарызонце – родны хутар Язавец...

Сцэнар сустрэчы быў складзены так, што знайшлося месца і для бацькоўскіх наказаў юбіляру. Анатоль Іванавіч запісаў іх на відыа ды аўдыя, захаваў запісы і частку прадставіў на імпрэзе. У выкананні маці, якая «спявала заўсёды, у любым настроі», прагучала некалькі мясцовых песень. Разнастаіў сустрэчу і відыазапіс з расповедам таты і мамы пра іх ваеннае вяселле (якое адбылося ўлетку 1944 года), пра тагачаснае жыццё. Багата пра тыя часы распавёў і сам юбіляр, абапіраючыся на расповеды бацькоў. Сапраўды, цёплую краязнаўчую вечарыну падаравалі нам усім Анатоль Іванавіч і іншыя яе арганізатары.

Заключным акордам стала песня «Малітва» на верш Янкі Купалы ў выкананні Уладзіміра Мулявіна. Слухалі яе стоячы.

А на другі дзень юбілейная сустрэча адбылася ў Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь, дзе была адкрытая выстаўка твораў Паўла Татарнікава – ілюстратара кніг А. Бутэвіча.

*Лявон ПАЛЬСКІ*
*Фота Наталі КУПРЭВІЧ*



*Узнагарода ад Міністэрства інфармацыі*



*«Васількі» ад БФК*